# ТЭМА МАЛОЙ РАДЗІМЫ Ў ВЫСТАВАЧНАЙ І АСВЕТНІЦКАЙ ДЗЕЙНАСЦІ МУЗЕЯ ГІСТОРЫІ ГОРАДА МІНСКА

***Ю. В. Кавалёва,***
*магістр культуралогіі,*
*вядучы навуковы супрацоўнік Музея гісторыі горада Мінска*

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Згодна з загадам № 247 Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь 2018–2019 гг. пройдуць пад знакам Года малой радзімы. Дадзены дакумент прыняты з мэтай стымулявання сацыяльна-эканамічнага развіцця рэгіёнаў, фарміравання актыўнай грамадзянскай пазіцыі ў насельніцтва, захавання гісторыка-культурнай спадчыны. Савету Міністраў даручана сумесна з абласнымі выканаўчымі камітэтамі і Мінскім гарадскім выканаўчым камітэтам распрацаваць і зацвердзіць рэспубліканскую праграму мерапрыемстваў па дадзенай тэматыцы да 2020 г., а таксама забяспечыць каардынацыю дзейнасці дзяржаўных органаў і іншых арганізацый па выкананню дадзенай праграмы [3].

Па сваіх мэтах загад пераклікаецца з фундаментальнымі мэтамі ўстаноў культуры і сацыяльнымі функцыямі музеяў у прыватнасці. Так, задача фарміравання актыўнай грамадзянскай пазіцыі набліжаецца да выхаваўчай функцыі музея. Захаванне гісторыка-культурнай спадчыны ўвогуле можна аднесці да ключавой ідэі існавання музея як сацыяльнага інстытута. Нават у стымуляванні сацыяльна-эканамічнага развіцця рэгіёнаў музеі адыгрываюць усё большую ролю праз актывізацыю турыстычнай дзейнасці [5, с. 326–329]. Таму відавочна, што музеі Беларусі актыўна далучыліся да мерапрыемстваў Года малой радзімы.

Экспазіцыйна-выставачная і адукацыйна-выхаваўчая дзейнасць Музея гісторыі горада Мінска ў 2018–2019 гг. у многім падпарадкавана задачам Года малой радзімы. Музей ад-

носіцца да гістарычнага профілю, аднак у яго структуры працуюць не толькі гістарычныя, але і мастацкія, мемарыяльныя, этнаграфічныя экспазіцыі. Па сутнасці, установа ўяўляе сабой музейнае аб'яднанне комплекснага характару і арыентавана на развіццё гарадскога краязнаўства (горадазнаўства, Мінсказнаўства). Менавіта краязнаўства (горадазнаўства) дазваляе ўсебакова вывучыць пэўную тэрыторыю, спазнаць патрыятычныя, духоўна-маральныя традыцыі сваёй малой радзімы. Адной з адметных функцый гарадскога музея, якая вызначае яго спецыфіку і прызначэнне з'яўляецца выхаваўчая. У параўнанні з нацыянальнымі і гістарычнымі музеямі, якія заклікаены выхоўваць патрыятызм на дзяржаўным узроўні, музеі гарадоў арыентаваны на фарміраванне пачуцця грамадскай свядомасці і самаідэнтыфікацыі ў маштабах горада або рэгіёна.

У рамках экспазіцыйна-выставачнай дзейнасці Музея гісторыі горада Мінска Году малой радзімы былі прысвечаны мастацкія праекты Кастуся Качана «Правінцыя», Ірэны Гудзіеўскай «Сімвалы Беларусі. У пошуках…», творчай сям'і Шаппо «Струста. Даубле. Рычы. Саванар» [1]. Ідэя аб тым, што «ўсе мы родам з вёскі», аб'ядноўвае тры праекты. Для гарадскога музея дадзеная тэма надзвычай актуальная. Праблема міграцыі як унутранай, так і знешняй абмяркоўваецца на міжнародным узроўні. Так, на штогадовай канферэнцыі Міжнароднага савета па калекцыях і дзейнасці музеяў гарадоў (САМОС) у 2015 г. тэмай была абрана «Памяць і міграцыя, горад і яго музей» [4]. Канферэнцыя мела на мэце выявіць значэнне мігрантаў з унутраных абласцей і з-за мяжы ў фарміраванні ўнікальных характарыстык горада ў ходзе яго гістарычнага і культурнага развіцця. Гарадскія музеі ў дадзеным кантэксце разглядаліся як дыскусійныя пляцоўкі для сацыяльнай інтэграцыі ў зменлівым горадзе, як цэнтры памяці.

Выстаўка «Правінцыя» Кастуся Качана была прысвячэннем аўтара сваёй малой радзіме – утульнай беларускай

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

правінцыі, любоў да якой ён захаваў праз гады жыцця ў вялікім горадзе. Экспазіцыя выявіла прыярытэты, характэрныя амаль усім карцінам мастака, – традыцыйная архітэктура, каларыт жыцця вясковага чалавека, непаўторная, пранікнёная прыгажосць беларускай прыроды.

Фотапраект Ірэны Гудзіеўскай «Сімвалы Беларусі. У пошуках…» акрамя выстаўкі прэзентаваў насычаную культурна-адукацыйную праграму. Пісьменніца Лёля Багдановіч напісала цыкл «Бабуліна казка», кампазітар Леанід Шырын стварыў музычнае афармленне выстаўкі, дызайнер Юрый Кот распрацаваў калекцыю адзення з ільну. Мэта праекта заключалася ў тым, каб падкрэсліць годнасць і аптымізм беларускіх сімвалаў. Ірэна Гудзіеўская працуе як студыйны фатограф, а таксама займаецца пейзажнай фатаграфіяй. Нягледзячы на тое, што большую частку жыцця фотамастак жыве ў Мінску, яе галоўнай тэмай застаюцца краявіды беларускай прыроды, тэма малой радзімы.

Праект творчай сям'і Шаппо «Струста, Даубле, Рычы, Саванар» таксама быў прысвячэннем Году малой радзімы. Спецыфіка выстаўкі заключалася ў тым, што яе аўтары – члены адной сям'і, якая пераехала ў Мінск з Віцебска. Памяць пра малую радзіму мастакі захоўваюць у сваёй творчасці. Цыкл лекцый і творчых сустрэч у рамках выстаўкі таксама быў прысвечаны Віцебшчыне. Члены сям'і Шаппо падкрэсліваюць каштоўнасць прафесійнай і дынастычнай пераемнасці, памяці пра свае карані.

Такім чынам, дадзеныя выставачныя праекты выяўляюць спецыфіку самога гарадскога музея як цэнтра памяці, што складаецца з асабістых гісторый жыхароў горада, якія не заўсёды былі мінчанамі. Як вынік, мультыкультурная атмасфера сталіцы адбіваецца і на рабоце музея.

Адукацыйна-выхаваўчая дзейнасць Музея гісторыі горада Мінска накіравана на фарміраванне ў гараджаніна пачуцця прыналежнасці да гарадской супольнасці, патрыятызму,

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

неабыякавага стаўлення да сваёй малой радзімы. Гэтыя мэты пастаўлены і перад доўгатэрміновай выстаўкай «Мінская прапіска». Экспазіцыя прадстаўляе сабой гісторыка-бытавую рэканструкцыю інтэр’ераў гарадской кватэры 1960–1980 гг. Усе экспанаты выстаўкі – арыгінальныя рэчы, якія належалі жыхарам Мінска. Фонды музея штогод папаўняюцца прадметамі побыту ХХ ст. Неабыякавыя мінчане перадаюць рэчы, што выйшлі з ужытку на пастаяннае захоўванне. У выніку сфарміраваліся цэлыя калекцыі сем’яў звычайных мінчан Беразоўскіх, Цэдрыкаў, Сяргеевых, Урэцкіх, Талалавых, а таксама народнага архітэктара СССР Г. Заборскага, вядомага архітэктара Л. Нардштэйн, заслужанага дзеяча мастацтваў Беларусі Л. Дударэнкі і іншыя.

У анатацыях да прадметаў выстаўкі «Мінская прапіска» ўказана інфармацыя пра іх былых уладальнікаў з выражэннем падзякі. У эксплікацыі гучыць заклік да мінчан стаць удзельнікамі выстаўкі і перадаць у фонды музея прадметы матэрыяльнага быту савецкай эпохі. Як правіла, гараджане не заўсёды разумеюць каштоўнасць такіх рэчаў. Экспазіцыя дае падказку, наглядна тлумачыць патрэбы музея ў тых ці іншых прадметах. Такі падыход дэманструе сваю эфектыўнасць. За час работы экспазіцыі многія наведвальнікі ператварыліся ў здатчыкаў прадметаў музейнага значэння і, верагодна, адчулі важнасць захавання спадчыны сваёй сям’і, значэнне кожнага гараджаніна ў стварэнні музея.

Для папулярызацыі выстаўкі сярод маладога пакалення створаны Instagram-акаўнт. Ён з’яўляецца важнай складанай часткай экспазіцыі. Распрацавана сістэма публікацый, прысвечаных асобным экспанатам, іх гісторыі і гісторыі іх уладальнікаў [2].

Такім чынам, дзейнасць гарадскога музея неадрыўна звязана з тэмай малой радзімы. Гэта вызначаецца профілем установы, яе накіраванасцю на развіццё горадазнаўства, самой місіяй музея. Выставачная і асветніцкая дзейнасць Му-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

зея гісторыі горада Мінска з'яўляецца яскравым прыкладам рэалізацыі асноўных накірункаў праграмы Года малой радзімы.


*1.* Афіша. Музей гісторыі горада Мінска [Электронны рэсурс] / Дзяржаўная ўстанова «Музей гісторыі горада Мінска». – Рэжым доступу: http://minskmuseum.by/afisha. – Дата доступу: 24.07.2019.

*2.* Instagram [Электронный ресурс] / Выставка-квартира. – Режим доступа: https://www.instagram.com/minsk_flat/. – Дата доступа: 24.07.2019.

*3.* О проведении Года малой родины [Электронный ресурс]: Указ Президента Респ. Беларусь, 20 июня 2018 г., № 247 // Президент Республики Беларусь : официальный интернет-портал. – 2018. – Режим доступа: http://president.gov.by/uploads/documents/2018/247uk.pdf. – Дата доступа: 24.07.2019.

*4.* Программа 10-й Юбилейной конференции Международного комитета коллекций и деятельности музеев городов (CAMOC/ICOM), 2–4 сен. 2015 г., Музей Москвы [Электронный ресурс]. – 2015. – Режим доступа: http://network.icom.museum/fileadmin/user_upload/minisites/camoc/programma-ok.pdf. – Дата доступа: 24.07.2019.

*5. Юренева, Т. Ю.* Музееведение : учеб. для студ. гуманит. спец-й высш. учеб. заведений / Т. Ю. Юренева. – М. : Академия, 2004. – 558 с.


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## НАСЛЕДИЕ В. Н. РЯБЦЕВИЧА В СОЦИАЛЬНО-ФИЛОСОФСКОМ И ПОЛИТОЛОГИЧЕСКОМ КОНТЕКСТЕ


***В. Ю. Казанина,***

*аспирант кафедры белорусской и мировой художественной культуры Белорусского государственного университета культуры и искусств*


Роль научных исследований, посвященных нумизматике Республики Беларусь, в развитии ряда направлений отечественной гуманитаристики, особенно социально-философских дисциплин и политологии, сегодня трудно недооценить. Изучение нумизматических древностей как артефактов определенной эпохи позволяет определить специфические черты